# ЦІМАФЕЙ САВЯНОК



## «Мустанг» у еўрапейскім стэпе

Апавяданне

Савянок Цімафей нарадзіўся 1 кастрычніка 2002 года ў Маладзечне. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Цікавіцца пытаннямі экалогіі, дэфіцыту энерганосьбітаў, алічбоўкі чалавечага розуму, месцам рэлігіі ў сусвеце будучыні. Піша прозу. Лаўрэат Міжнароднага моладзевага анлайн-конкурсу навуковых і навукова-фантастычных работ «Гарызонт-2100». Жыве і працуе ў Мінску.

Раніца пачалася з гэнага тройчы праклятага рынгтону на старэнькім смартфоне. Роберт з невыноснай цяжкасцю расплюшчыў вочы, намацаў рукою апарат і паднёс да невідушчых спрасонку вачэй. Нявызначаны нумар. А каб на яго халера!..

— Алё!

— Добры дзень, вас вітае разумны дом, які вы яшчэ не набылі і на які можаце атрымаць спецыяльны ко...— манатонная прамова «робата» перарвалася кароткімі гудкамі. Антыспам-сістэма апошнім часам пачала дрэнна працаваць.

Роберт адклаў тэлефон, цяжка ўздыхнуў і сеў на ложку. Асвечаны ранішнімі промнямі пакой адкрыў яму ўсю сваю непрывабную сутнасць. Стары робат-пыласос за пяць гадоў безупыннай працы канчаткова зламаўся, а навюткі з завода запісвае на камеры ўсё, што патрапіцца. Таму ўжо болей за два тыдні мужчына не мог даць рады з прыбіраннем — надта адвык ён ад гэтага дзеяння.

Роберт намацаў пасярод featureзнага хламу і смецця пантофлі, устаў і паклыпаў у лазенку. З бруднаватага люстэрка на яго глядзеў заспаны мужчына амаль пяцідзесяці гадоў, парослы шматдзённым шчаціннем. Бясконца стомлены сваім змаганнем, бессэнсоўнасць якога разумее і сам.

Сёння ў яго ўрэшце ёсць шанц зарабіць: з'явіўся кліент. Зрэдчас да яго яшчэ звяртаюцца, хоць шоу з удзелам нармальных аўтамабіляў — каб рухавік рыкаў, дым з-пад колаў і ўсё вось гэта — робяцца ўсё меней папулярныя. Дзе-нідзе аўтамабілі з рухавіком унутранага згарання цяпер наогул забароненыя...

У гаражы непадалёк чакаў акурат адзін такі. Пакуль раніца, ёсць магчымасць праскочыць па вуліцах, не сустрэўшы патруль, а тады ўжо шашою праз палі да самай мяжы. У суседняй краіне яшчэ можна набыць паліва і кліенты ёсць.

# ВЕРАНІКА ЛАЙКОВА



## Плач, паэце!

Вершы

Лайкова Вераніка нарадзілася 14 кастрычніка 2005 года ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці. Студэнтка факультэта дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Займаецца ў літаратурным аб'яднанні «Актава». Жыве ў Барысаве.

### Артысту

Голас замоўк,
Слёзы не льюць,
Вусны і сэрца ў здранцвенні —
Сум адгані, роспач забудзь:
Выйсце тваё — на сцэне!

Духам адзін
У свеце даўно.
Побач не людзі — сцены.
З іх табе ёсць выйсце адно,
Выйсце адно — на сцэне!

Цемра ў вачох,
Глуха вакол.
Смерці заўчасныя цені.
І нават скрозь цемень вякоў
Выйсце тваё — на сцэне!

✦ ✦ ✦

Жыццё — імгненне,
як і лета;
Каханне наша —
кветкі ў полі...
Не затрымаць
хвіліны гэтай,
Але вянок — як верш —
трывае болей.

### Няспраўджаная надзея

Ах, як балюча ў свет надзею несці
І забіраць надзею адначасна:
На скон асуджаных спадзевам песціць
І вечна шанс другі дарыць няшчасным.

Бо не аддзячаць. Толькі слова злое
І гора ўзнагародай атрымаеш.
Ах, як балюча шкадаваць пра тое,
Што толькі добрага людзям жадаеш!

# ГАННА БАГУШЭВІЧ



## Цягнік на Вільню

Навела

Багушэвіч Ганна нарадзілася 28 кастрычніка 2005 года ў Мінску. Вучыцца на аўтатрактарным факультэце Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Піша вершы і прозу. Лаўрэат літаратурна-паэтычнага конкурсу «Муза ў тэхнічным інтэр'еры». Жыве ў Мінску. Літаратурны дэбют у «Маладосці».

### Спатканне

Гэта быў месяц, калі дні ўжо значна карацейшыя за ночы, але сонца яшчэ лашчыць зямлю сваімі цёплымі промнямі, месяц, калі спеюць журавіны,— а ён знайшоў найвялікшае шчасце і страціў усё. Гэта быў верасень.

Ён ніколі не любіў вандраваць. Натоўпы людзей, гарачае, з пахам поту, паветра ў вагонах, плач дзяцей і бурчанне бабуль, якія едуць у вёскі з горада,— усё гэта ператварала некалькі гадзін у непамерна вялікі прамежак часу. Ён ніколі не мог зразумець людзей, якія ездзілі ў цягніках дзеля задавальнення. Марудны пейзаж за вокнамі ды мерны грукат колаў наганялі на яго нуду.

У той дзень ён ехаў у вёску да цёткі. Жанчыне было ўжо нямала гадоў, і кожную восень яна плакалася, што хутка памрэ, таму хоча перад смерцю ўбачыць пляменніка. Штогод ён садзіўся на вячэрні цягнік, каб адразу з раніцы перарабіць усе справы, што патрабавалі мужчынскай рукі, і вярнуцца ў Мінск, але ў гэты раз цётка папрасіла яго прыехаць раней. Ён тады крыху пашкадаваў пра лішнія траты, але купіў білет на цягнік на Вільню, які ішоў раніцай. Кошт білета мала што змяніў: усё тыя ж натоўпы людзей і малыя дзеці. Не было толькі, бадай, вясковых бабуль.

Ён убачыў яе не адразу. Яна сядзела побач з ім і чытала нейкую страшэнна тоўстую кнігу. Яе валасы колерам нагадвалі жытняе поле, а сонечныя промні надавалі ім мільёны адценняў — ад ззяючага светлага золата да глыбокага цёмна-рудога. Ён першы раз бачыў такія валасы. Дзесьці ў памяці маланкай бліснуў успамін аб маці-нябожчыцы. Мяккія чорныя пасмы — адзінае, што памятаў пра бацькоў.

# ЖАННА МІУС



## З вясновага...

Вершы

Міус (Усцінава) Жанна нарадзілася 18 студзеня 1976 года ў вёсцы Капачы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Працавала настаўнікам, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. Аўтар кніг паэзіі «Лунный чай», «Інтанацыя», «Мае медуніды» і кніг для дзяцей «Странные детки», «Первоапрельский суп», «Нескучательная дочка», «Сиреневая Соня в Чудесонии», «Рыцарь кастрюли с шумовкой», «На пытанне ёсць... паданне», «Малёк Удалёк і Жах-Рыба», «Панч і Чоха», «Майка». Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя А. Пысіна, а таксама шэрагу літаратурных конкурсаў.

### На пупавіне Сусвету

У кагосьці душа ўцéпленая —
луской, поўсцю, пярэстым пер'ем...
У паэта душа — шматцерпная
і трымціць галаскурым даверам.
Нараджаецца не бязгрэшнасцю,
але з іскраю боскай задачы:
добрыць свет,
кранальна, усмешліва,
і нябачнае паўсюль бачыць.
Дзе любоў змізарнела пад сонцам
і дзе вера ў людзях радзее,
сілкаваць слоў прыгожых моцаю
рост апошняй кволай надзеі...
Усе паэты з душою загадкавай,
і таму неадрыўна, адвеку,
ім вісець з чысцінёй немаўляткавай
на пупавіне Сусвету.

### Вяртанні

Я вярнуся
з вачыма-нябёсамі,
з дзёрзкай плынню разводдзя рэк.
На крыле, матылькова-пялёсткавым,
прылячу расквяціць твой век.
З цемры вырвуся яркаю знічкаю,
каб прад вокам тваім у вышыні
марай вы́зарыцца — па звычаі —
і падоўжыць шчаслівыя дні.
Я сцюдзёнасцю снежнай, храбу́сткаю,
пад твой крок упаду ніц.
Раздухмя́нюся па-над вуснамі
пацалункам сакаўных суніц.
Прадажджу́ю вільготай спатольнаю
на засмяглы ў хваробе дзень.
Накурлычу жураўкаю вольнаю
незабыўных яскравых падзей...

Пойдзем далей шляхамі расстаннымі.
Збочу я з цяжкай утомай павек.

# ПЯТРО ЖАЎНЯРОВІЧ



## Варта дзівіцца

Вершы

Жаўняровіч Пятро нарадзіўся 2 студзеня 1959 года ў вёсцы Азярэц Вілейскага раёна. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта працаваў выкладчыкам у Мінскім прафесійным каледжы электронікі і Беларускім дзяржаўным універсітэце. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Аўтар зборніка паэзіі «Расторганая прастора», дзвюх манаграфій, «Даведніка па літаратурнай праўцы», дапаможнікаў па рэдагаванні. Пераклаў на рускую мову творы Уладзіміра Караткевіча, на беларускую мову — раман Фёдара Дастаеўскага «Браты Карамазавы» і інш.

### Сляза ялінкі

Сляза ялінкі падае на снег
І там блішчыць ільдзінкай крышталю.
Я ёй пагляд ад смагі наталю,
І стане свет шчаслівым, нібы ў сне.

У ім жывуць дзяцінства карагод,
І палкага кахання першацвет,
І наймудрэйшы дзедаў запавет,
Замова маці ад усіх нягод.

У свеце тым няма часцінак зла,
Няма паклёпаў, крыўдаў і бяды.
Ялінкі слёзы не даюць сляды
Пры надыходзе подыхаў цяпла.

Ялінкі слёзы не прыносяць боль,
Яны святлом працяты дабрыні
Калядных ёлак — свята чараўніц,
У іх слязу не дадаецца соль...

### Полацк Францішка Скарыны

Гэту песню, што лунае ў паднябессі —
Развітальны кліч адлёту журавоў,—
Чуе Нарач, чуе Прыпяць, чуе Бесядзь
І вада зялёных замкавых равоў.

Гэту песню, без сумнення, неаднойчы
З берагоў сваёй спакойнай Палаты
Чуў Скарына, які месячнаю ноччу
Любаваўся на свой Полацк залаты.

І Францішак адышоў ад дома крэўных,
Пад «курлы» зацята думаў зноў і зноў:
Ён у вырай хутка вылеціць напэўна,
А ці вернецца, як птушкі, ён дамоў?

Бо не марыў стаць купцом — яго намеры
З кнігай звязаны былі, каб просты люд
Мог чытаць святую кнігу — кнігу веры,
Мо тады паменшыць гора і пакут.

# НАВУМ ГАЛЬПЯРОВІЧ



## Вось і я...

Аповесць

Гальпяровіч Навум нарадзіўся 14 студзеня 1948 года ў Полацку. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Працаваў карэктарам, старшым літсупрацоўнікам полацкай аб'яднанай газеты «Сцяг камунізму», рэдактарам радыёвяшчання ПА «Палімір», карэспандэнтам наваполацкай газеты «Хімік», уласным карэспандэнтам Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні па Віцебскай вобласці, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Вожык». З 2002 па 2024 год — галоўны рэдактар, намеснік галоўнага дырэктара, затым — галоўны дырэктар дырэкцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё (радыёстанцыя «Беларусь»), намеснік дырэктара канала «Культура» Беларускага радыё. Цяпер — на тэлебачанні. Аўтар шматлікіх кніг вершаў і прозы, аўтарскіх радыёперадач і тэлевізійных праектаў. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Ганаровы грамадзянін Полацка і Наваполацка. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

Я дайшоў. У вас гарыць святло...
*(З даўняга верша)*

Рэдакцыя нашай газеты месцілася на трэцім паверсе вялікага трохпавярховага будынка райвыканкама. Цэнтральная частка з высокім ганкам і калонамі складалася з трох паверхаў, а з абодвух бакоў літарай «П» крыламі разыходзіліся двухпавярховыя доўгія калідоры. Старэйшыя супрацоўнікі расказвалі, што ў пакалечаным бамбёжкамі ў вайну горадзе гэта была, бадай, першая адноўленая пабудова, у якой знаходзілася абласное ўпраўленне МДБ, бо Полацк тады з'яўляўся абласным горадам. Спецыфіка вымагала адпаведнай архітэктуры, і ў двары, куды выходзілі вокны нашага кабінета, стаяў досыць ёмкі двухпавярховы будынак музычнай школы. Дырэктар гарадскога музея па прозвішчы Казлёнак, які часта прыносіў свае здымкі ў рэдакцыю, казаў, што там раней была турма.

— Вы зайдзіце паглядзіце, якія там лёхі. Выдатныя музычныя класы цяпер, гукаізаляцыя выключная!

Ад Казлёнка пахла часнаком і тытунём, ён часта сплёўваў пры гаворцы, бывала, блытанай і невыразнай. Яго здымкі, якія прыносіў у рэдакцыю, змяшчаліся на палосах газеты, і гэта, мяркуючы па ўсім, больш задавальняла, чым непасрэдная праца ў музеі.

Многія яго гісторыі тычыліся якраз падзей, звязаных з мінулым нашага будынка. Ён нават сцвярджаў, што загадчык гаспадаркі райвыканкама, мажны высокі дзяцюк, працаваў раней начальнікам турмы. Сам няштатны аўтар нярэдка бываў на лёгкім падпітку, таму да яго гісторый мы адносіліся крыху паблажліва.

PUBLIC TALK

# Тэатр мінулага, сучаснасці і будучыні: паміж рэфлексіяй і хіхікам

*Думаць пра будучыню і марыць пра яе — гэта думкі аднаго парадку? Ці ёсць наогул сэнс у бясплотных разважаннях? І ці могуць яны дапамагчы нам справіцца са страхам нявызначанасці? Як жыць без будучыні, не разабраўшыся ў сучаснасці і не адрэфлексіраваўшы мінулае?*

*26 сакавіка ў прасторы тооон+ сабраліся эксперты, каб паспрабаваць разабрацца ў гэтых пытаннях. І дапамагчы сабе і астатнім зразумець: якім будзе тэатр будучыні? Наколькі мы гатовыя да таго, што ён можа нам прапанаваць?*

*Аўтары падкаста «Кантровыя» Мікалай Касцюкоў і Ксенія Зарэцкая запрасілі на размову актрысу Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Ганну Гаспадарык, рэжысёра Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Кірыла Балтрукова і псіхолага, прэс-сакратара Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Жанну Гурыну. У абмеркаванні таксама ўдзельнічалі гледачы.*



**Ганна Гаспадарык:**
*«Я працую ў тэатры ўжо дзесяць гадоў. І граю, па сваім поўным перакананні, у самых топавых спектаклях найлепшай краіны, у асноўным — у майго любімага рэжысёра Яўгена Карняга».*



**Кірыл Балтрукоў:**
*«Дзесяць гадоў я выдаткаваў на тое, каб прафесійна атрымаць харэаграфічную адукацыю, каля дзесяці гадоў прапрацаваў артыстам балета. А пасля стаў самастойна ставіць спектаклі. З нядаўніх часоў супрацоўнічаю з многімі беларускімі рэжысёрамі, часам — з расійскімі, мяне запрашаюць для пастановкі пластычных нумароў».*



**Жанна Гурына:**
*«У РТБД я вяду два вельмі розныя, але ў той жа час падобныя праекты: «ТэатраТэрапія» і «Дыялогі ў закуліссі». Яны дапамагаюць гледачам зірнуць з іншага боку не толькі на любімыя спектаклі, але і на сябе саміх».*

## ЛЕТУЦЕННІКІ, РЭАЛІСТЫ І НІГІЛІСТЫ

● ***— Ці думаеце вы пра будучыню? Пра асабістую, прафесійную, тэатральную? Ці гэта здаецца бесперспектыўным заняткам для летуценнікаў?***

**ГАННА ГАСПАДАРЫК:**

— Я як актрыса заўсёды думаю пра будучыню. Пра сваіх гераінь, пра сваё месца ў тэатры. У нейкі момант кар'еры я так выгарэла, што наогул нічога не хацела. Тады і прыйшло ўсведамленне: трэба

планаваць сваё жыццё, выбіраць тое, што важна менавіта для мяне, і ставіць гэта ў прыярытэт. Мне не здаецца бесперспектыўным такі занятак, наадварот, ён дапамагае структураваць думкі, мэты і жаданні і ўсвядоміць важнасць не толькі дня заўтрашняга, але і сённяшняга.

**КІРЫЛ БАЛТРУКОЎ:**

— У тэатры пра будучыню не думаць немагчыма. Спектаклі, якія глядач убачыць у 2026 годзе, пачынаюць распрацоўвацца яшчэ ў 2024-м. І даводзіцца прыдумляць назву, падбіраць аснову. Можа, натхнення яшчэ няма, але справа не трывае адкладу, так і даводзіцца выкручвацца. Ну і па жыцці мне здаецца класным ставіць галачкі насупраць мэт на дзень, месяц, год. Гэта парадкуе жыццё.

**ЖАННА ГУРЫНА:**

— Важна думаць пра будучыню, але не жыць у ёй.

**А што думаюць гледачы?**




***— Калі б існавала машына часу і ў вас з'явілася магчымасць адправіцца ў мінулае ці будучыню, вы б ёй скарысталіся? Захацелі б паглядзець, ці ўсё атрымалася праз пяць, дзесяць гадоў? Ці сказаць нешта юнаму сабе?***

**КІРЫЛ БАЛТРУКОЎ:**

— У мінулае вяртацца дакладна сэнсу няма. Памылкі зроблены — і выдатна. Дзякуй за вопыт. Яны ж зрабілі мяне тым, хто я ёсць. А вось у будучыню... Карты таро я б расклаў, ну так, каб разумець, якую стратэгію выбіраць у той ці іншай сітуацыі *(смяецца)*. Мы ж творчыя людзі, натуры тонкія, бясконца сумняваемся. І чым больш перашкод на шляху, аб якія спатыкаешся, падаеш, збіваеш локці, тым складаней потым падняцца, атрэсціся і пайсці далей. У момант слабасці хочацца пазбегнуць такога, ведаць, што за наступным паваротам, але жыццё тады было б занадта лёгкім і нецікавым.

**ЖАННА ГУРЫНА:**

— А я б вярнулася назад да маленькай сабе і сказала: «Малышка, не мітусіся. Усё будзе». Бо маё жаданне зазірнуць у будучыню — яно як раз ад мітусні і нецярпення зыходзіць. Мне здаецца, гэта ад недаверу да свету. Я сабе нафантазіравала, як яно павінна быць, але ж ніхто не ведае, што для нас лепш, праўда? А мінулае — іншая справа. Зрэшты, гэта і без машыны часу можна арганізаваць дзякуючы псіхатэрапеўтычным практыкам.

**ГАННА ГАСПАДАРЫК:**

— Я 100 % хачу застацца ў сучаснасці і ні ў якім разе не вярнуся ў мінулае, не змяню там нічога. Я, напрыклад, доўга не магла паступіць у Акадэмію мастацтваў — тры гады. І вось, у дваццаць адзін нарэшце туды трапіла, і тое, на рэжысуру, бо палічыла, быццам занадта старая для прафесіі актрысы. І толькі пасля першага семестра перавялася на акцёрскі курс, была там самай дарослай. Але менавіта з-за ўсіх гэтых цяжкасцей я сустрэла Яўгена Карняга, тады яшчэ невядомага маладога хлопца, — яго запрасілі да нас ставіць дыпломны спектакль. Лёс звёў мяне з патрэбнымі людзьмі. А ў той час я забівалася, што не паступіла, у нейкі момант і майстрам па манікюры працавала, і ў цырку на стайні, і вяхоткі фасавала... Аднак нягледзячы на ўсе цяжкасці,

не вярнулася б, бо дзякуючы таму вопыту я цяпер знаходжуся тут. Я наогул сфакусаваная на сучаснасці, на момантце. Мне падабаецца, як усё развіваецца...

## А што думаюць гледачы?




## ЗМЕНЛІВЫ СВЕТ І МЫ Ў ІМ

***— За час вашай працы ў тэатры як ён змяніўся? Прагрэсіраваў, рэгрэсіраваў? А глядач — ці змяніўся ён?***

**КІРЫЛ БАЛТРУКОЎ:**

— Я бачу, што глядач дакладна стаў больш разумным, інтэлектуальным, але ў той жа час — больш патрабавальным. Вядома, застаўся працэнт людзей, якія ходзяць толькі на лёгкія камедыі, аднак бачныя добрыя знакі. Яшчэ пару гадоў таму на сучасную харэаграфію часта не збіраўся зал — паказ адмянялі за нерэнтабельнасцю. А зараз — гэта рэнтабельна. І людзі ходзяць. І глядач гатовы да складаных рэчаў, прагне іх. Што тычыцца тэатральнай прасторы, тут усё стала крыху больш строга: цяпер нельга выкарыстоўваць лаянку на сцэне, нельга бутэлькі з алкаголем трымаць — зразумелая справа, усе вадзіцу п'юць, але для некаторых спектакляў важна натуралістычнасць, а нельга. Мой маладзёжны тэатр таксама зведаў каласальныя змены. Калі я прыйшоў — гэта была трупа, якая калясіла з памяшкання ў памяшканне з-за рамонту. А потым хоба — і мы заязджаем у прастору, поўную мармуру і ляпніны, у якой некалькі залаў. Усё мяняецца і трансфармуецца, і я гляджу на гэта пазітыўна.

**ЖАННА ГУРЫНА:**

— Мне цяжка казаць так глабальна. Гэта ўзяцце чужой адказнасці, а тут бы сваю панесці... Глядач змяняецца па-за залежнасці ад часу, але ў залежнасці ад сваіх жаданняў і патрэбаў. Тыя, хто прыходзяць на «Дыялогі ў закуліссі», хочуць пабачыцца з любімымі акцёрамі, зарадзіцца іх энергіяй. Наведвальнікі «ТэатраТэрапіі» спрабуюць зазірнуць у сябе, задаюцца пытаннем: «Чаму ж пакуль я тут плачу, сусед справа рагоча? І чаму мяне гэта так злуе?» Я не раз бачыла ў РТБД, калі адзін глядач вучыў іншага, як правільна разумець спектакль. Аднак кожны з нас пры праглядзе апрацоўвае свае траўмы. І тое, што табе падабаецца сёння, можа не выклікаць ніякага эмацыйнага водгуку праз некалькі гадоў. Гэта нармальна. Галоўнае, не пераходзіць межы іншага чалавека.

## А што думаюць гледачы?




***— Як вам здаецца, герой пластычнага спектакля ў сваім невербальным існаванні бліжэй, радней гледачу, чым герой драматычнага спектакля? Або бязмоўнасць, наадварот, аддаляе яго ад гледача?***

СТАРОНКА РОДНАЯ

# ВІКТОРЫЯ КЛЯЎКО

## Мая Нарач

Зноў у дарозе.

Прагна глытаю знаёмыя пейзажы за акном цягніка, узіраюся ў размытую лінію гарызонту.

Зноў да Нарачы.

Якая яна з моманту нашай апошняй сустрэчы?

Якая я з таго часу?

Хвалююся.

Хвалюецца.

Надвор'е ў гэтыя дні абяцалі вельмі драматычнае. Беспрасветная вада з неба дні напралёт, вада захапіла ўвесь пасёлак, расплюхалася бурбалкамі глыбокіх лужын па асфальце, накарміла сакавітую майскую зеляніну квітнеючых каштанаў, намёртва ўбіўшы россыпы іх пялёсткаў у патрэсканую зямлю.

Вадой адзінай сплаўлены гэты край:
салёнай і прэснай,
глыбіннай і паверхневай,
рэчышчамі і залівамі азёр,
быццам крываноснай сістэмай цэлага арганізма, імя якому Нарач.

Нас шмат такіх, якія рухаюцца ў бок вялікай вады, кожны да сваёй, каб паставіць кропку, унутры і на карце, і перайсці да новага этапу свайго падарожжа па жыцці.

Новыя эмоцыі.

Новыя адчуванні.

Новыя ўражанні.

Новыя месцы на карце свету.

Новыя знаёмствы і кантакты ў тэлефоннай кніжцы.

Новыя любімыя рэчы, знойдзеныя па дарозе.

Імкненне да пазнання новага і засваення свету ляжыць у аснове чалавечай прыроды. Размыць, пашырыць межы знешняга, каб вырасці ўнутры.

А што, калі для росту неабавязкова змяняльнасць і навізна?

А што, калі для росту важная сталасць і здольнасць бачыць?

Лёгка быць турыстам у новым месцы, глядзець на нязведанае свежым поглядам, захапляцца, бачыць прыгажосць у простым, штодзённым.

Самы звычайны разгалісты ружовы куст ля пад'езда.

Не ля вашага пад'езда.

Не ў вашым горадзе.



*Кляўко Вікторыя нарадзілася 20 верасня 1989 года ў Мінску. Скончыла факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, курсы пісьменніцкага майстэрства (проза) у Літаратурным інстытуце імя А. М. Горкага, цяпер працягвае навучанне на Вышэйшых літаратурных курсах Літінстытута. Аўтар праекта пра беларускую культуру і мастацтва «МанаЛІТ36». З раманам «Вырай» стала лаўрэатам літаратурнага конкурсу «LitUp» (2024). Літаратурны дэбют у «Маладосці».*

# АНАСТАСІЯ МЕЛЬНІК

## Да Элізы

Колькі мне было тады гадоў? Не памятаю. Можа, чатырнаццаць, а можа, менш. Мы з класам паехалі ў Гродна, альбо ў Гародню, як выразна падкрэсліваў наш гісторык. Ён родам з гэтых мясцін, таму надта жадаў паказаць нам усе чароўныя куточкі, якімі б жудаснымі яны нам ні здаваліся.

Так мы апынуліся на старых. Самых старых у Беларусі. Могілках. Гэта нават зараз, праз гады, трэба падкрэсліць асабліва. На жаль, вы не пачуеце яго голас і інтанацыю, але ж уявіце сабе. Сталы высокі мужчына з сівымі валасамі і яскравым барытонам, які амаль не змяніў час, прамаўляе:

— Кажуць, яна не любіла Гародню. Але раю вам: пачытайце яе тэксты. І вы самі зразумеце ўсё лепш, чым нашы гісторыкі пішуць.

Гэты помнік не адрозніваўся ад іншых наогул нічым. Каб не шыльда пра гістарычную каштоўнасць, цяпер вы нават і не спыніліся б. Ну муж. Ну жонка. Ён першы, яна за ім. І так, і не. Тады шыльды яшчэ не было, але было шмат кветак. На такое на пустых могілках усё ж звернеш увагу.

— Увесь горад хараніў Ажэшку. Міліцыі было шмат — але ўсё прайшло ціха. Народ проста развітваўся. Ажэшка і цяпер збірае ля сябе. У Гародні існуе павер'е, што калі закаханыя пасядзяць тут удваіх, то іх каханне будзе шчаслівым і на ўсё жыццё.

Я не разумела, чаму ў жыцці ўсё круціцца вакол гэтай тэмы, як і не ведала, навошта выходзіць замуж. Ажэшка так доўга чакала разводу, што каханне зноў і зноў шукала яе. Цікавая гісторыя, але зусім не мая.

Уразілі мяне іншыя помнікі, якія засталіся ў маёй галаве па сёння, — ствалы дрэў з абсечанымі галінамі. Такіх было шмат. Застылыя ў камені, яны нагадвалі вядомую метафару аб абарваным жыцці, якое канчаткова спынялася тут. На гэтым месцы, на гэтых могілках.

У той дзень мы шмат дзе былі: у касцёлах, у Новым і Старым замках, парках і Каложы. Але самае моцнае ўражанне на мяне зрабілі абсечаныя галіны ў камені.

* * *

Час літаральна цягнуўся да восьмага сакавіка, але я не звяртала на гэта ўвагі — шмат працы. Адзіны вольны вечар амаль за цэлы месяц. Толькі не забыць! Не забыць купіць букет кветак для мамы. Вось і ўсе мае планы.

Сама я ні ад каго нічога не чакала. Вельмі стамілася ад апошніх сваіх адносінаў, калі праз пяць гадоў пачула, што ён не бачыць мяне сваёй жонкай. А сама я, на жаль, за гэты час пачала чакаць. Праз тую



*Мельнік Анастасія нарадзілася 2 чэрвеня 1994 года ў Мінску. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, працуе там старшым выкладчыкам. Літаратурны дэбют у «Маладосці».*